

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2023 года*

## *БЛАНК ЗАДАННЯЎ*
## 9 клас
## Варыянт 2

**Заданне 1.** Запішыце насупраць змешчаных у табліцы слоў прапушчаныя ў іх спалучэнні галосных літар.

*Максімальная колькасць балаў –* **7.**

**Заданне 2.** Спалучыце словы з левага слупка з іх значэннямі ў правым слупку, напрыклад, А1Б2В3Г4Д5Е6.

*Максімальная колькасць балаў –* **6.**

| Словы | Значэнні слоў |
|---|---|
| *А. Абцас* | 1. Ажурныя, сятчастыя вырабы з нітак для аздобы бялізны, адзення |
| *Б. Гаплік* | 2. Металічны кручок для зашпільвання адзення |
| *В. Камізэлька* | 3. Раменны пояс |
| *Г. Карункі* | 4. Цвёрдая набойка на падэшве абутку пад пятой |
| *Д. Брыль* | 5. Кароткая адзежына без рукавоў і каўняра, якую надзяваюць на сарочку або блузку |
| *Е. Папруга* | 6. Шаўковая тканіна з кароткім густым ворсам |
| | 7. Капялюш, казырок шапкі |

**Заданне 3.** Беларуская мова валодае разнастайным наборам суфіксаў, якія пры іх далучэнні да асноў якасных прыметнікаў могуць надаваць апошнім дадатковую афарбоўку, вельмі тонка перадаючы розныя эмацыянальныя або ацэначныя нюансы зместу.

Паспрабуйце раскрыць гэты патэнцыял беларускай мовы і ўтварыце як мага большую колькасць формаў прыметнікаў, ужываючы для гэтага розныя суфіксы ацэнкі, ад асновы прыметніка *высокі*.

**Заўвага.** Утвораныя формы павінны адпавядаць норме літаратурнай мовы і быць простымі па структуры (мець толькі адну аснову).

*Максімальная колькасць балаў –* **5.**

**Заданне 4.** Учытайцеся ўважліва ў беларускія абазначэнні прыблізнага часу. Вызначце часцінамоўную прыналежнасць вылучаных слоў.

*Максімальная колькасць балаў –* **7.**

**Заданне 5.** З кожнага рада выберыце нумар правільнага варыянта словаформы (словаформаў) з прапанаваных у дужках. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў (напрыклад, А1Б2В3Г1Д2Е3).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

А: Здавалася, зубраня адчула сябе (пераможцам[1], пераможцэм[2], пераможцай[3]).

Б: Засмяялася на небе сонейка і пачало (праменнямі[1], прамянямі[2], праменнемі[3]) лічыць на стрэхах ледзяшы.

В: Магілёў у мінулым – адзін з (буйнейшых[1], самых буйнейшых[2], найбуйнейшых[3]) гарадоў Беларусі.

Г: Падводы ехалі па (абодвух[1], абаіх[2], дваіх[3]) берагах ракі.

Д: Выкладчык праэкзаменаваў (дваццаць пяць[1], дваццаці пяці[2], дваццацці пяці[3]) студэнтаў.

Е: (Некаму[1], не было каму[2], не каму[3]) дапамагчы Надзеі Пятроўне, увесь груз сямейнага клопату яна цягнула на сваіх плячах.

**Заданне 6.** Вызначце ў кожнай з трох прапанаваных груп сказаў трэці лішні сказ з улікам наступных абмежаванняў: віду сродкаў сувязі галоўнай і даданай часткі (I); сінтаксічнай функцыі злучальнага слова (II); віду даданай часткі (III). Патлумачце свой выбар.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

I. 1) Я полымя ўзношу святое і мару ў халоднай траве, што гэта цяпло дарагое да вокнаў тваіх даплыве *(Р. Семашкевіч).*

2) Што вясною пасееш, тое восенню збярэш *(прыказка).*

3) Людзі сталага веку перакананыя ў тым, што камяні растуць *(Э. Ляўкоў).*

II. 1) Практычна ў нас на Беларусі, як лічаць вучоныя, няма ніводнай гістарычнай назвы, пра якую не была б складзена адна ці некалькі легендаў аб яе паходжанні *(Л. Лыч).*

2) Калісьці над возерам, ля вёскі Белякоўшчына, стаяў маёнтак пана Рудаміна (дарэчы, славуты род часоў ВКЛ), у якім колькі год мясцілася школа *(В. Быкаў).*

3) Нават крапіву, якой частавалі мяне за некаторыя грахі майго дзяцінства, забаранялася збіваць без прычыны пугаю *(У. Дубоўка).*

III. 1) Настаўніца на першы раз сказала дзяўчатам пайсці да Насці і паглядзець, як яна жыве *(К. Чорны).*

2) Культура кожнага народа, зразумела, найлепш вызначаецца тым, як ён ставіцца да сваёй гісторыі, духоўных традыцый папярэдніх пакаленняў *(Л. Лыч).*

3) Яна [Яноўская] размаўляла пра каханне так, як іншыя жанчыны пра надвор’е *(У. Караткевіч).*

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Волька окинул грустным взором опустевшую парикмахерскую. Ещё дымилась на полу намоченная в кипятке салфетка, которую несчастный мастер собирался приложить в виде компресса к побритым щекам не менее несчастного клиента. Вокруг кресел валялись в беспорядке ножницы, бритвы, кисти для бритья, машинки для стрижки волос. В мыльницах сиротливо белела пышно взбитая мыльная пена.

*По Л. Лагину*

**Заданне 8.** Насупраць праўдзівых выказванняў пастаўце “+”, а насупраць непраўдзівых – “-”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

**Заданне 9.** Уважліва прачытайце выказванні літаратуразнаўцаў. Вызначце, пра які твор ідзе гаворка і хто яго аўтар. Адзначце, якім малюнкам праілюстраваны ці мог бы быць праілюстраваны гэты твор (у табліцы ўкажыце літару, якой ён абазначаны).

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

I Асновай сюжэта <…> з’яўляецца канфлікт паміж князем і гусляром. <…> за свой смелы ўчынак гусляр паплаціўся жыццём: яго жывым закапалі ў магіле. Фінал <…> заклікае чытачоў “слухаць душой” курганы, якія “шмат чаго нам гавораць”. <…> Апошнія радкі твора заклікаюць “зразумець голас” гэтых курганоў, каб “не зазнаў бы ніколі больш гора” той, хто зможа “слухаць душой”.

*А.М. Макарэвіч*

II Сюжэтную аснову аповесці складае гісторыя пра тое, як шасцёра байцоў восенню 1941 года, ужо недзе пасля Смаленска, крыху няпоўныя суткі абаранялі “звычайны чыгуначны пераезд, якіх нямала параскідана на сталёвых шляхах зямлі”. Праўда, гэта своеасаблівыя суткі – на працягу іх загінуць усе героі. Менш чым на паўсотні старонках тэкставай прасторы пісьменнік здолеў з псіхалагічнай дакладнасцю вызначыць сутнасць кожнага героя.

*М.І. Верціхоўская*

III У цэнтры п’есы, як і ўсёй творчасці <пісьменніка>, – праблема абуджэння і фарміравання сацыяльна-палітычнай і духоўнай свядомасці народа, узвелічэнне нацыянальных асноў яго жыцця. Тэма камедыі – канфлікт паміж старым і новым у тагачасным беларускім грамадстве, канфлікт пакаленняў. Характэрныя рысы новага пакалення, што ўваходзіла ў жыццё, – узрастанне ўзроўню нацыянальнай свядомасці, любоў да свабоды, развіты асабовы пачатак, увасоблены перш за ўсё ў вобразе <галоўнай гераіні>. Гэты новы тып беларускі <пісьменнік> заўважыў у асяроддзі менавіта моладзі. Падобны да яе і <…> вясковы настаўнік. <…> Гэта маладая Беларусь. Выраз “маладая Беларусь” быў вельмі папулярны ў тыя часы. Адзін з шырокавядомых вершаў паэта той пары так і называўся “Маладая Беларусь” (1911–1912).

*У.В. Гніламёдаў*

IV Апавяданне <…> адлюстроўвае адзін з самых чалавечых грахоў – адрачэнне ад маці. Апавядальнік расказвае, як ужо з дзяцінства нарастае сынава адчужэнне, як саромеецца ён уласных бацькоў, як забывае пра іх, а потым, будучы ўжо гарадскім адвакатам, не прызнае ў старой беднай сялянцы <…> сваю родную маці. <…> Гэты твор пераконвае чытачоў у тым, што сляпая бацькоўская любоў, а потым адарванасць ад родных каранёў і сям'і фарміруюць эгаіста, які дзеля ўласнай выгады адмовіцца ад маці, ад Радзімы, ад мовы.

*А.В. Шарапава*

| А | Б |
| --- | --- |
|  |  |
| *В.Ф. Шматаў*<br>*“Маці”* | *А.М. Кашкурэвіч*<br>*Ілюстрацыя да твора* |
| В | Г |
|  |  |
| *М.С. Басалыга*<br>*Ілюстрацыя да твора* | *А.М. Кашкурэвіч*<br>*Кампазіцыя “Песня жаўранка”* |

**Заданне 10.** Напішыце тэкст літаратуразнаўчага або гісторыка-літаратуразнаўчага характару, абавязкова ўключыце як мага болей пералічаных ніжэй слоў і словазлучэнняў (пададзены ў алфавітным парадку праз кропку с коскай): *адухаўленне; вобраз; грамадзянская лірыка; Максім Багдановіч; скульптура*.

Патлумачце, для каго напісаны ваш тэкст, дзе ён будзе размешчаны.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*